

*Купальскі дзядок. Малюнак В.Слаука. 2005.*

**КУПА́ЛЬСКІ ДЗЯДО́К**, Дзядок, Дзедка, Ох, Дабрадзей, персанаж беларускай міфалогіі і чарадзейных казак сюжэтнага тыпу СУС 560 («чарадзейнае кальцо»), які кантамінуецца з сюжэтам СУС 554 («удзячныя жывёлы»). Гнасеалагічныя вытокі К.д. ў вобразах першапродка ў індаеўрап. міфалогіі Дзьяўса («той, які ззяе»). Звычайна ён прыходзіў на дапамогу нечакана, калі герой трапляў у бязвыхаднае становішча. У фальклоры і маст. л-ры 19—20 ст. ў вобразе К.д. акумулюецца сумарны сац., інтэлектуальны і духоўны вопыт этнасу. У апавяданнях «Драўляны дзядок і кабета Інсекта» і «Што здарылася з Драўляным дзядком» Я.Баршчэўскага ў асобе К.д. ўвасоблена мудрасць філосафаў, якая незапатрабавана ў грамадстве. Тыпалагічна блізкія па характары да К.д. героі раманаў «Язэп Крушынскі» З.Бядулі (М.Гаробчык), «Вязьмо» М.Зарэцкага (Галілей), аповесці «Міколка-паравоз» М.Лынькова (Дзед) і інш.

*Літ.:* Матерь Лада и её семья. Божественное родословие славян. Минск, 2003.

*А.У.Рагуля.*

**КУПА́ЛЬСКІЯ ПЕ́СНІ**, купальныя песні, купалкі, янаўскія песні, баравое, творы летняга песеннага цыкла, якія складаюць найб. значную ч. каляндарна-абрадавага фальклору беларусаў. У К.п. займаюць важнае месца матывы сонечнага культу, паколькі Купалле — стараж. свята ў гонар летняга сонцастаяння: «А на Купалу // Рана сонца йграла, // На добрыя годы, // На цёплыя росы, // На хлебы-ўраджаі...» Касмічная тэматыка знаходзіць далейшае развіццё ў творах, прысвечаных месяцу, да якога звяртаюцца з магічнымі заклінаннямі («Ой, месяц, месяц, узыдзі ранюсенька, ...засвяці яснюсенька, завядзі купаленьку, ...дзевачкам гуляць, месяца ўсхваляць...»). Не менш важнае значэнне ў К.п. надаецца раскрыццю культаў — зямлі, агню, вады, а таксама ўвасабленню рытуальных дзей пры зборы зёлак і траў, шэсці да вогнішча, яго распальванні, ваджэнні карагодаў, назіранні за «ігрой» сонца. Вял. група твораў раскрывае вобраз Купалы (Купалкі), што мае язычніцкі, таямнічы характар («Ішла Купала сялом, сялом», «Купалка Івана на вулу звала», «Сядзіць Купалка на плоце»). Увогуле К.п. без уліку твораў міфал. зместу, звязаных з купальскімі культамі, падзяляюць на 2 тэматычныя групы: у першую ўваходзяць песні агр. кірунку, у другую — творы любоўнай, сямейна-быт. тэматыкі. Агр. матывы ў песнях увасобіліся ў язычніцкім і хрысціянскім ракурсах. Так, Купалка «боб палола», «кужалі прала, ткала, бяліла», дзевачкам «у ручкі сярпочкі давала», паведамляла, што ёй «трэба жыта пільнаваць, трэба кароў вартаваць». Святыя ў К.п. заняты выключна гасп. справамі: «пайшоў Ілля каля жыта», каб даведацца, «чыё жыта добрае, харошае», св. Пятро пільнуе «жыта й пшаніцы ад тое ведзьмы-чараўніцы», а св. Ян арэ ляды, сее ячмень, каб «солад расціць, піва варыць, сына жаніць». У К.п. назіраецца яднанне, перапляценне земляробчай, быт. і любоўнай тэматыкі. У найб. ступені ідэйна-маст. накіраванасць К.п. акрэсліваюць любоўныя матывы, пераважна сямейна-быт. кірунку. Лічылася, што Купалле — пара росквіту прыродных сіл, фіз. і духоўнага развіцця чалавека, што і знайшло ўвасабленне ў К.п. У многіх творах любоўная лірыка мае мэтавую ўстаноўку на прыстойны стан паводзін, заключае павучальны маральна-этычны сэнс, засцерагае дзяўчат ад інтымнай блізкасці з хлопцамі ў купальскую ноч («На вуліцы скрыпкі йграюць», «У цёмным лесе гоман, гоман», «У нашага войта на дварэ»). У некаторых творах, якія маюць характар балады, адносіны паміж хлопцам і дзяўчынай набываюць часам драм. характар («То-то-то! Чаму сілязень смуцен, невясёл? То-то-то»). У К.п. у вобразнай форме перадаецца маральны вопыт жыцця многіх пакаленняў, ён вучыць дабрыні, праўдзівасці ў адносінах, непрыняццю зла, шчырасці, вернасці ў каханні, вышэй за ўсё ставіць у чалавеку сумленнасць, працавітасць, яго розум. У песні «Цераз горачку тры сцежачкі, божа наш!» герой шукае сэнс жыцця і прыходзіць да маральнай высновы: «...— А золата хоць прыпазычу, // А коніка хоць прыкуплю, // А розуму ані ўцяць, ані ўзяць». К.п. вызначаюцца святочным настроем, дасціпнай выдумкай, прыёмамі маст.-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці, мерай густу, пачуццём іроніі і гумару, жыццесцвярджальным пачаткам. Многія з іх выконваюцца ў вучэбнай і аматарскай практыцы харавых спеваў пры падрыхтоўцы і правядзенні рэжысёрамі купальскага свята.

*Літ.:* Ліс А.С. Купальскія песні. Мінск, 1974; Купальскія і пятроўскія песні. Мінск, 1985.

*А.М.Аляхновіч.*

**КУПА́ННЕ**, гл. *Абмыванне немаўляці.*

**КУПЛЕ́Т** (франц. couplet), 1) музычная пабудова, якая паўтараецца з розным паэт. тэкстам. У 14 ст. тэрмін «К.» абазначаў 2 радкі, аб'яднаныя рыфмай, пазней — паэт. страфу. Музыка К. звычайна адпавядае вершаванай страфе. Мае форму перыяду. У нар. абрадавай песні К. складаецца